

«Звязда» адорвае падпісчыкаў!

СТАР. 3



Пост-драматычны «ТэАрт»

СТАР. 4



Гісторыя жыцця генерала

СТАР. 5



Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

17 КАСТРЫЧНІКА 2015 г. СУБОТА № 201 (28059) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА


# ПРАБЛЕМЫ ЛЕПШ ВЫРАШАЦЬ РАЗАМ

## Парадак дня інтэграцыйных аб'яднанняў на постсавецкай прасторы

**Учора ў Казахстане кіраўнікі дзяржаў СНД і ЕАЭС абмяркоўвалі актуальныя пытанні развіцця гэтых арганізацый. Удзел у абодвух самітах браў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка.**



Фота БЕЛТА.

На пасяджэнні Савета кіраўнікоў дзяржаў-удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў беларускі лідар заклікаў: «У СНД трэба брацца за абмеркаванне сур'ёзных праблем на постсавецкай прасторы і, наколькі гэта магчыма, стымуляваць тых, ад каго сёння залежыць іх вырашэнне. Не будзе гэтага — мы будзем ісці па нахільнай да згасання нашага супрацоўніцтва».

Садружнасць стане аўтарытэтнай і запатрабаванай, калі будзе вырашаць галоўныя, актуальныя пытанні, прадоўжыў Прэзідэнт і ў якасці прыкладу прывёў канфлікты ў Нагорным Карабаху, Прыднястроўі, Украіне. «Мы неяк нават сарамліва сыходзім ад гэтых пытанняў, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Мы як быццам прывыклі, чакаем, што амерыканцы, Еўрасаюз, яшчэ хто прыедзе, і гэты «моцны дзядзька» нам скажа, у якім кірунку вырашаць гэтую праблему або вырашыць яе за нас».

З'явіліся новыя ўтварэнні на постсавецкай прасторы, дзе ёсць магчымасць больш глыбока абмяркоўваць існуючыя праблемы, лічыць Прэзідэнт. Гэта і Еўразійскі эканамічны саюз, і Саюзная дзяржава, найбольш прасунутая форма інтэграцыі, і АДКБ, і іншыя арганізацыі. «Асабліва мы ў апошні час зрабілі крэн на двухбаковых адносінах, аддалі фактычна ім прыярытэт. Гэта значыць, з'явілася вельмі шмат відавочных тэндэнцый на постсавецкай прасторы, якія штурхаюць нас да таго, што СНД трэба неадкладна прыстасаваць да рэалій сённяшняга дня», — звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнікі дэлегацый у ходзе пасяджэння ў вузкім фармаце павіншавалі Аляксандра Лукашэнку з пераканаўчай перамогай на прэзідэнцкіх выбарах і пажадалі яму поспехаў у адказнай дзейнасці. Прэзідэнт канстатаваў, што мінулыя прэзідэнцкія выбары былі цяжкай кампаніяй для Беларусі. Паводле яго слоў, было вельмі важна, як прагаласуюць беларусы пры такім моцным вонкавым уплыве. «Мы спрабавалі аднавіць адносіны з Еўрапейскім саюзам, адным з нашых асноўных гандлёва-эканамічных партнёраў. Я гэтага не ўтойваў: мы зрабілі ўсё, што папрасілі нашы партнёры. Пасля выбараў было пастаўлена пытанне, што далей, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Прыйшлося прызнаць, што ў Беларусі выбары прайшлі ў адпаведнасці нават з тымі стандартамі, якіх у нас няма, але якія ад нас патрабуюць пастаянна ў ААН, АБСЕ, ПАСЕ і іншых структурах». Кіраўнік дзяржавы растлумачыў, што падрабязна спыняецца на гэтым пытанні, паколькі нешта падобнае чакае пасля ўсе краіны СНД — «прыйдзецца вельмі карэктна даказваць сваю магчымасць кіраваць дзяржавай».

На ўчарашнім пасяджэнні Савета кіраўнікоў дзяржаў СНД было разгледжана 17 пытанняў. Лідары краін Садружнасці прынялі заявы ў сувязі з 70-годдзем стварэння ААН, аб барацьбе з міжнародным тэрарызмам, ухвалілі зварот у сувязі 30-й гадавінай аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Акрамя таго, быў зацверджаны пакет дакументаў, накіраваных на далейшае ўмацаванне ваеннага і прыгранічнага супрацоўніцтва, разгледжаны кадравыя пытанні. Падчас пасяджэння Аляксандр Лукашэнка ўручыў Прэзідэнту Казахстана Нурсултану Назарбаеву ордэн Дружбы народаў.

* * *

Аляксандр Лукашэнка правёў таксама сустрэчу з расійскім лідарам Уладзімірам Пуціным. На ёй абмяроўваліся надзённыя пытанні Саюзнай дзяржавы.

Прэзідэнт Беларусі прапанаваў вызначыцца і канчаткова прыняць рашэнні па тых пытаннях, па якіх яны наспелі, або на пасяджэнні Вышэйшага дзяржсавета, або падчас яго візіту ў Маскву. Закранаючы супрацоўніцтва ў СНД, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ў Беларусі і Расіі супадаюць пункты гледжання па ўсіх пытаннях.

Уладзімір Пуцін у сваю чаргу яшчэ раз павіншаваў Аляксандра Лукашэнку з перамогай на выбарах і выказаў упэўненасць у працягу эфектыўнай сумеснай работы па ўдасканаленні механізмаў Саюзнай дзяржавы, у сферы эканомікі, узгаднення пазіцый на міжнароднай арэне, у сацыяльнай сферы.

СТАР. 2

# ЗАЎЖДЫ НА ВЫШЫНІ



**Менавіта так можна сказаць аб прафесіі электрамантажніка. Яна актуальная і запатрабаваная ў любую пару года і ў горадзе, і ў вёсцы. Напрыклад, лінейную брыгаду Шаркаўшчынскіх раённых электрасетак наш фотакарэспандэнт зняў за працай літаральна днямі — хлопцы праводзілі чарговы рамонт лініі. І на зямлі не скажаш, што цёпла, а ўверсе... «Нічога, работа ў нас такая», — весела адказвае Яўген ПАЛЯЛЕЙКА, спрытна ўпраўляючыся на сяміметровай вышыні.**

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

*ЛІЧБА ДНЯ*

## На Br100 трлн

*прадалі харчовых тавараў арганізацыі гандлю краіны сёлета за студзень—жнівень, паведамілі ў Нацыянальным статыстычным камітэце. У сярэднім за месяц насельніцтва купляла прадуктаў прыкладна на Br12,5 трлн, а ў разліку на душу насельніцтва прыпадала каля Br1,3 млн за месяц. Спажыўцы па-ранейшаму аддаюць перавагу харчовым таварам айчыннай вытворчасці. У першым паўгоддзі сярод рэалізаваных арганізацыямі гандлю харчовых тавараў айчынная прадукцыя складала 82,1%. Па шэрагу тавараў попыт пакупнікоў практычна цалкам задавальняецца за кошт прадукцыі беларускіх вытворцаў. Да такіх тавараў адносяцца яйкі (100%), масла (99,8%), цукар (99,6%), мяса і мясныя прадукты (99,5%).*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 17.10.2015 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 17194,00 | ▼ |
| Еўра | 19534,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 280,00 | ▲ |
| Укр. грыўня | 807,99 | ▲ |

### КАРАТКА

**Ільготныя крэдыты на рэалізацыю інвестыцыйных праектаў у Беларусі будуць выдзяляцца толькі па конкурсе.**

У Беларусі бульба ўбрана з 95,5% уборачных плошчаў, накапана больш за 1,1 млн т з улікам фермерскіх гаспадарак, ураджайнасць у сельгасарганізацыях складае 220 ц/га.

**Дазволеную скорасць на другой Мінскай кальцавой аўтадарозе (МКАД-2) да зімы плануецца знізіць да 70 км/г.**

XII фестываль духоўнай музыкі «Залатагорская ліра» пройдзе ў Мінску 16-30 кастрычніка ў мінскім касцёле Найсвяцейшай Тройцы (святога Роха).

**Жаночая зборная Беларусі стала бронзавым прызёрам у каманднай гонцы праследавання на чэмпіянаце Еўропы па трэкавых велагонках, якія праходзяць у швейцарскім Грэнхене.**

■ Выбары-2015

# УСЁ ПАДЛІЧАНА ДАКЛАДНА

**Цэнтральная камісія па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў пастанавіла, што выбары адбыліся. Пра гэта было аб'яўлена на ўчарашнім пасяджэнні ЦВК пасля аб'яўлення канчатковых вынікаў выбараў.**

За Аляксандра Лукашэнку прагаласавалі 5 102 478 (83,5%), за Сяргея Гайдукевіча — 201 945 выбаршчыкаў (3,3%), Таццяна Караткевіч набрала 271 426 галасоў (4,44%), Мікалай Улаховіч — 102 131 (1,67%), супраць усіх кандыдатаў прагаласавала больш за 380 тысяч чалавек (6,3%). Каля 48,8 тысячы бюлетэняў прызнаны несапраўднымі.

— На падставе сказанага і ў адпаведнасці з артыкулам 82 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, артыкулам 79 Выбарчага кодэкса Рэспублікі Беларусь Цэнтральная камісія Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў пастанаўляе: першае — прызнаць, што выбары Прэзідэнта адбыліся, другое — лічыць выбраным на пасаду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Лукашэнка Аляксандра Рыгоравіча, — заявіў **Мікалай ЛАЗАВІК, сакратар Цэнтральнай камісіі.**

Адказваючы на пытанні журналістаў наконт таго, чаму да адных камісій ёсць прэтэнзіі, а да другіх — не, **старшыня Цэнтрвыбаркама Лідзія ЯРМОШЫНА** выказала думку, што розніца ў метадах працы.

— Цалкам магчыма, недзе старшыні ў нас не вельмі добра засвоілі тую навуку, якую давала Цэнтральная камісія, і ёсць пэўныя хібы, — адзначыла яна. — Я ўпэўнена, што кожны з іх імкнуўся зрабіць сваю працу шчыра і добрасумленна — гэта і з'яўляецца самым галоўным.

У адказ на пытанне, чым цяперашняя кампанія лепшая за папярэднія, Лідзія Ярмошына ў першую чаргу назвала тое, што кампанія была спакойнай. Таксама яна звярнула ўвагу на той факт, што сродкі масавай інфармацыі давалі роўныя магчымасці для ўсіх кандыдатаў у Прэзідэнты, а таксама на тое, што ў краіне прывіваюцца новыя тэхналогіі як інфармавання выбаршчыкаў, так і вядзення ўсёй агітацыйнай кампаніі.

— У нас нашмат больш ліберальны рэжым для здзяйснення працэсу вылучэння кандыдата ў Прэзідэнты, а пасля вядзення перадвыбарнай агітацыі і прапаганды, — дадала старшыня Цэнтрвыбаркама. — Думаю, гэта і ёсць тое пазітыўнае, негатыву я б не адзначыла ўвогуле.

Падчас размовы з прадстаўнікамі СМІ Лідзія Ярмошына паведаміла, калі ж пачнецца наступная выбарчая кампанія ў нашай краіне — па выбарах дэпутатаў ніжняй палаты Нацыянальнага сходу. Па яе словах, сама кампанія пачнецца ў чэрвені, выбары ж пройдуць у верасні наступнага года.

— Думаю, пасля Новага года мы адразу пачнём ствараць матэрыялы для парламенцкіх выбараў, — праінфармавала старшыня Цэнтральнай камісіі.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*

ISSN 1990 - 763X

15201>

9 771990 763008

■ Грашовы калькулятар

# КАШАЛЁК БЕЗ БАНКНОТ

## Цяпер карткамі магчыма кіраваць і праз смартфон

**Банкаўская картка сёння стала такім жа звычайным атрыбутам нашага жыцця, як мабільная сувязь ці грамадскі транспарт. Усе мы ў той ці іншай ступені карыстаемся імі ў паўсядзённым жыцці, нехта штодня, кансерватары — мінімальна. Актыўных карыстальнікаў прываблівае ў разліках «пластыкам» зручнасць, прастата і хуткасць разлікаў. Аднак песімісты часам справядліва ўказваюць на тое, што карткамі пакуль яшчэ не ўсюды можна разлічыцца, здараюцца збоі абсталявання ў крамах і крадзяжы грошай з рахунку. Што трэба абавязкова ведаць усім нам, каб «падарожжа» ў сістэму безнаяўных плацяжоў заўсёды было беспраблемным? Кансультантам рэдакцыі на гэту тэму стаў <u>намеснік старшыні Асацыяцыі беларускіх банкаў Аляксандр КУЧЫНСКІ</u>.**

### «ПЛАСТЫК» З ФУНКЦЫЯЙ ДЭПАЗІТУ

Пры выбары тыпу карткі ўсё залежыць ад мэтаў, якія стаяць перад карыстальнікам. Магчыма, у вас ужо ёсць адна такая, выдадзеная ў рамках зарплатнага праекта. На яе прадпрыемства пералічвае аванс і заробак, ёю можна разлічвацца ў крамах, на транспарце, у кавярні і кінатэатры, а калі спатрэбяцца наяўныя грошы — здымаць іх у банкамаце.

Калі не хапае грошай на надзённыя патрэбы або буйную пакупку, можна афарміць крэдытную картку, асаблівасць якой у тым, што вы можаце распараджацца той сумай, якая знаходзіцца на ёй, у рамках адкрытай крэдытнай лініі. Карыстацца проста: калі набылі тавар у крэдыт, то неабходна своечасова яго пагашаць і не забываць выплачваць працэнты банку.

Цяпер шырока распаўсюджаны бонусныя карты (від крэдытных картак), якія прапануюць вяртанне на рахунак пэўнага працэнта патрачаных сродкаў, назапашванне балаў, якія можна выкарыстоўваць на куплю. Таксама плюсам такога пластыку з'яўляецца растэрміноўка вяртання пазыкі на некалькі месяцаў: пагадзіцеся, зручна купіць абутак або пыласос, а плаціць за іх невялікімі часткамі некалькі месяцаў, прычым без працэнтаў.

Банкаўская карта можа быць не толькі зручным інструментам разлікаў, але і сродкам зберажэння сваіх фінансаў. Сёння многія банкі выпускаюць зберагальныя карткі, якія выгадна спалучаюць у сабе атрыбуты дэпазіту, дзе на вашы грошы банк налічае нядрэнныя працэнты, і плацежнага кашалька, якім можна аплачваць тавары і паслугі. Плюсы такога спалучэння відавочныя, бо для зняцця грошай са звычайнага дэпазіту неабходна наведваць банк, які не адчынены кругласутачна, а калі спатрэбіцца вялікая сума, то грошы трэба заказваць за некалькі дзён. А вось для таго, каб зняць гатоўку са зберагальнай карткі, досыць візіту да звычайнага банкамата.

### ВЫБІРАЕМ ПЛАЦЕЖНУЮ СІСТЭМУ




Тут існуе два варыянты: нацыянальную ці міжнародную. Калі вы не плануеце выязджаць за межы Беларусі, то будзе дастаткова і «Белкарт». Пры наведванні іншай краіны трэба мець картку сістэмы Visa або Master Card. Звярніце ўвагу, што за мяжой больш выгадна будзе расплачвацца карткай, намінаванай у замежнай валюце. Можна выкарыстоўваць і рублёвую, але тады пры аплаце будзе праходзіць абмен рублёў на валюту той краіны, дзе праходзіць плацеж.

З рахунку спішацца прыкладны рублёвы эквівалент сумы, а канчатковы разлік можа адбыцца праз некалькі дзён па курсе на момант завяршэння аперацыі. Зразумела, што пры паездцы ў Еўропу лепш завесці картку ў еўра, пры падарожжы ў ЗША — у доларах, каб пры аплаце не ажыццяўлялася дадатковая канвертацыя адной валюты ў другую.

### ЗА КАМФОРТ ТРЭБА ПЛАЦІЦЬ ДАДАТКОВА

Фінансавыя ўстановы часам прапануюць сваім кліентам прэміяльныя банкаўскія карткі. Шараговы карыстальнік наўрад ці адчуе розніцу пры аплаце імі пакупак у краме, бо такія карткі даюць перавагі свайму ўладальніку пры пражыванні ў гасцініцы, арэндзе аўтамабіля, аплаце авіябілетаў і ў іншых выпадках, звязаных з камфортам. Напрыклад, прэміяльны «пластык» можа прадугледжваць бясплатнае карыстанне VIP-залай у аэрапорце.

Але трэба заўважыць, што кожны сэрвіс каштуе грошай, таму гадавое абслугоўванне прэміяльных картак будзе істотна даражэйшым, чым Visa Classic або Mastercard Electronic.

СТАР. 2